# *§ 27–0. Развіццё гарадоў, рамёстваў і гандлю на тэрыторыі Беларусі

**1. Беларусь у сістэме еўрапейскіх эканамічных сувязей.** Беларусь здаўна знаходзілася на скрыжаванні найважнейшых гандлёвых шляхоў з усходу на захад і з поўначы на поўдзень. Гэтая акалічнасць не магла не паўплываць на развіццё знешняга гандлю, якім займалася заможная частка купецтва — госці. У XIV–XV стст. беларускія гарады былі звязаныя трывалымі гандлёвымі стасункамі з гарадамі Маскоўскага вялікага княства, Наўгародскай і Пскоўскай зямель, Польшчы, краін Скандынавіі, Свяшчэннай Рымскай імперыі, Візантыі, венгерскімі і малдаўскімі гарадамі. У Рызе рэзідэнцыяй купцоў з Полацка і Пскова быў «рускі падворак», пры якім дзейнічала праваслаўная царква Святога Мікалая. Спрэчкі паміж беларускімі і мясцовымі нямецкімі купцамі разглядаліся ў спецыяльных судах. Адным з асноўных прадметаў экспарту Полацка ў Рыгу быў воск, а назад імпартавалі срэбра. У Польшчу і Прыбалтыку беларускія купцы экспартавалі тавары гарбарнай і ганчарнай вытворчасці, футраныя вырабы, мыла. Гандаль вёўся оптам, часцяком тавар прадавалі ў крэдыт.

Асноўнымі гандлёвымі шляхамі па-ранейшаму выступалі рэкі Заходняя Дзвіна, Нёман, Заходні Буг, Дняпро, Прыпяць. Усё большую ролю набывалі сухапутныя гандлёвыя шляхі, якія называліся «гасцінцамі». Перасякаючы межы, купцы павінны былі дэклараваць свой тавар і плаціць спецыяльную даніну — мыта.

Назавіце найбуйнейшы гандлёва-палітычны саюз, што дасягнуў свайго росквіту ў Познім сярэднявеччы. Успомніце, якія гарады Беларусі былі яго партнёрамі.

Ад канца XV ст. асноўным напрамкам знешняга гандлю зрабіўся заходні вектар — гандаль з краінамі Заходняй Еўропы праз парты Рыгі, Кёнігсберга, Гданьска. Найважнейшай гандлёвай артэрыяй была

Заходняя Дзвіна, па якой ажыццяўляўся выхад у Балтыйскае мора, гандаль з Даніяй, Швецыяй, Свяшчэннай Рымскай імперыяй і іншымі дзяржавамі. У XV ст. асноўнымі экспартнымі таварамі ВКЛ з'яўляліся футра і воск.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Адным з галоўных тавараў, якія Беларусь пастаўляла на міжнародныя рынкі, быў воск.

*Якія гістарычныя ўмовы спрыялі таму, што воск зрабіўся асноўным экспартным таварам на тэрыторыі Беларусі?*

У Сярэднявеччы попыт на воск быў вельмі высокі, а гандаль ім ператварыўся ў прыбытковую дзейнасць. Напачатку XIV ст. толькі з тэрыторыі Падзвіння вывозілася штогод ад 5 да 10 тон воску, які з Рыгі адпраўляўся ў нямецкія землі, Фландрыю і Англію.

*Што рабіла воск такім каштоўным прадуктам? Прывядзіце не менш за тры аргументы.*

Беларускія купцы адсочвалі кан'юнктуру знешняга рынку і рэагавалі на яе змены. З павелічэннем у Заходняй Еўропе попыту на збожжа напрыканцы XV ст. пачынаецца экспарт гэтага тавару ў еўрапейскія краіны.

Актыўны гандаль вёўся з Расійскай дзяржавай. Беларускія купцы падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з Масквой, Цвер'ю, Смаленскам, Псковам, іншымі рускімі гарадамі. Выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча спрыяла актыўнаму развіццю транзітнага гандлю. Праз Беларусь у краіны Заходняй Еўропы з Расіі пастаўляліся футра, воск, асобныя віды тканін. Гэтымі таварамі беларускія купцы гандлявалі ў Кракаве, Варшаве, Гданьску, Кёнігсбёргу. У Расію цераз Беларусь завозіліся заходнееўрапейскія тавары: сукно, шоўк, металічныя вырабы (нажы, цвікі, косы), галантарэя, прыправы, папера, прадметы раскошы. З Украіны ў Беларусь паступалі соль, турэцкія дываны і іншыя ўсходнія тавары.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

### Дагаворная грамата вялікага князя літоўскага Казіміра з Вялікім Ноўгарадам аб усталяванні міру і ўмовах вядзення гандлю з Полацкам і Віцебскам (1440 г.) (Вытрымка)

Я, вял. кн. Казімір, каралевіч усяе Літоўскай зямлі і Жамойцкае і многіх Рускіх зямель, заключыў мір вечны з уладыкам наўгародскім з Яўфіміем і з пасаднікам з Фёдарам з Алісеевічам, і з тысяцкім Сямёнам Цімафеевічам, і з Вялікім Новым горадам. А прыехалі ад Навагорада Ёсіф Васільевіч, сын пасадніч, а ад жыхараў Цімафей Іванавіч, з тымі мір і заключыў.

А што да маіх людзей: або літвін, або віцяблянін, або палачанін, або смалянін, або з іншых нашых Рускіх земель, — тым шлях чысты з усёй маёй айчыны: гандляваці ім у Ноўгарадзе без усякай перашкоды, па-старому, а гандляваці з новагародцамі; а хто прыедзе з вялікага князя таварам, гандляваці ім з наўгародцамі ў Нямецкім двары.

Таксама і наўгародцам з усяе Наўгародскае вол. гандляваці без перашкод па ўсёй Літоўскай зямлі.

А мне, вял. кн. Казіміру, каралевічу, берагчы наўгародца, як і свайго літвіна; таксама і наўгародцам берагчы літвіна, як і свайго наўгародца…

1. *Хто такія Ёсіф Васільевіч, Цімафей Іванавіч і якую ролю яны адыгрывалі ў заключэнні гэтай дамовы?*
2. *Якія правы і абавязкі мелі жыхары Вялікага Княства Літоўскага і Ноўгарада адны перад аднымі згодна з гэтым пагадненнем?*
3. *Чаму ў тэксце згадваецца Нямецкі двор у Ноўгарадзе? Якая была роля гэтага двара ў гандлі?*
4. *Якія наступствы мела гэтая дамова для адносін паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Наўгародскай рэспублікай?*

Наступнае развіццё рамяства і гандлю, актывізацыя транзітнага гандлю стварылі ўмовы для паступовага ўзрастання ролі Беларусі ў сістэме еўрапейскіх эканамічных сувязей.